# Спецыфіка карэкцыйна-аднаўленчай працы пры аферэнтнай маторнай афазіі

Склала:
выкладчык
кафедры лагапедыі БДПУ
Лагун Т.Т.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

**Асноўнай задачай аднаўленчага навучання** пры аферэнтнай маторнай афазіі з'яўляецца аднаўленне артыкуляцыйнай дзейнасці хворага з мэтай аднаўлення яго вуснага экспрэсіўнага маўлення.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

**Л.С. Цвяткова** вылучыла **4 стадыі** аднаўленчага навучання пры аферэнтнай маторнай форме афазіі.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Задачай **<u>першай стадыі</u>** навучання з'яўляецца:

аднаўленне міжвольных маўленчых працэсаў (пералік, дні тыдня, спевы і г.д.).

Важна выкарыстоўваць рэшткі эмацыянальнага маўлення, аднаўленне імёнаў блізкіх хвораму людзей, чытанне вершаў.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Да асноўных прыёмаў працы **на першай стадыі навучання** адносяцца:

* вылучэнне рытміка-меладычнай структуры фразы;
* чытанне вершаў пад акампанемент іх рытмічнай структуры;
* парадкавы пералік прадметаў з апорай на палачкі, прадметы, пальцы і г.д.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Асноўнай задачай аднаўленчага навучання на **<u>другой стадыі</u>** з'яўляецца аднаўленне вымаўлення слоў шляхам перабудовы парушанай маўленчай функцыі, г.зн. ажыўленне і ўзбагачэнне сэнсавых сувязяў.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

* Пачынаецца гэтая праца з спробаў аднавіць вымаўленне слова цалкам, без выразнай артыкуляцыі складаючых яго гукаў.
* Асноўны шлях - пераключэнне ўвагі хворага з артыкуляцыйнага боку маўлення на агульную сэнсавую і гукавую структуру слова.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Да асноўных метадаў працы **на другой стадыі навучання** адносіцца:

***метад сэнсаваслыхавай стымуляцыі слова***: перад хворым выкладваецца невялікая група малюнкаў, на якіх намаляваны пэўны прадмет або дзеянне, якія ўваходзяць у розныя частотныя і вядомыя хвораму сітуацыі. Кожны прадмет або дзеянне паслядоўна ўводзіцца лагапедам у разнастайныя сэнсавыя сувязі або кантэксты. Пры гэтым лагапед увесь час захоўвае агульную рытміка-меладычную структуру дадзенага слова. У гэтых умовах хворы вымаўляе ўслед за лагапедам адпрацоўваемае слова, паўтараючы толькі яго інтанацыйна-меладычны малюнак без выразнай артыкуляцыі складаючых яго гукаў.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

**На другой стадыі навучання могуць выкарыстоўвацца наступныя прыёмы працы:**

* класіфікацыя прадметаў і дзеянняў, намаляваных на малюнках, па зададзеным прыватным або агульным прыкметам;
* маляванне прадметаў у адпаведнасці з адпрацоўваемымі словамі;
* абмацванне блізкіх да адпрацоўваемага прадметаў і г.д.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Асноўнай задачай <u>**на трэцяй стадыі**</u> навучання з'яўляецца гука-артыкуляцыйны аналіз складовых элементаў слова.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Да асноўных метадаў работы **на трэцяй стадыі навучання** адносіцца:

***метад рытмічнага выдзялення элементаў слова*** шляхам адстуквання яго складовай структуры з практыкаваннямі ў напеўным прагаворванні.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

На гэтай стадыі ***вядзецца праца над пісьмом і чытаннем*** як метадамі навучання вуснаму маўленню. Пры пісьме і чытанні неабходна ўсвядомленная аперацыя гука-літарнага аналізу. Менавіта таму, на гэтай стадыі падключаецца праца над пісьмовым маўленнем. Хворы складае адпрацоўваемае слова з літар разразной азбукі, а затым запісвае і прачытвае яго, і толькі потым - самастойна вымаўляе яго.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Асноўная задача **чацвёртай стадыі** навучання заключаецца ў тым, каб перавесці хворага ад умення вылучаць гука-літарныя элементы слова да ўмення іх артыкулявання, г.зн. патрэбна аднавіць уласна кінэстэтычныя схемы артыкуляцый.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Да асноўных метадаў работы **на чацвёртай стадыі навучання** адносяцца:

* метад імітацыі артыкуляцыйных поз - па ўзору лагапеда з кантролем перад люстэркам;
* метад выдзялення гуку і слова, якія ёсць у актыўным слоўніку хворага;
* метад адпрацоўкі пазіцыйных варыянтаў артыкулем.

# Карэкцыйна-аднаўленчая праца пры аферэнтнай маторнай афазіі

Сувязнае фразавае маўленне пры аферэнтнай маторнай афазіі аднаўляецца хутка, як толькі аднаўляецца сістэма артыкуляцыі, і не патрабуе спецыяльнага навучання.

# Літаратура:

1. Цвяткова, Л.С. Афазія і аднаўленчае навучанне / Л.С.Цвяткова. - М., 1988.
2. Шохар-Троцкая, М.К. Карэкцыйна-педагагічная работа пры афазіі / М.К. Шохар-Троцкая. - М. 2002.